ВОДГУК
на аўтарэферат дысертацыі Федарэц Яны Ўладзіміраўны
«Нацюрморт у беларускім жывапісе ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя»
на атрыманне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Нацюрморт з'яўляецца адным з асноўных жанраў у беларускім выяўленчым мастацтве ХХ - пачатку ХХІ стагоддзя. Паколькі да гэтага часу ў айчынным мастацтвазнаўстве не існавала абагульняючых навуковых прац па дадзенай тэме, імкненне Я. У. Федарэц правесці падобнае даследаванне выклікае відавочныя сімпатыі.

Адметнай рысай навуковага даследавання Я. У. Федарэц з'яўляецца вывучэнне вялікага аб'ёму фактычнага матэрыялу, яго сістэматызацыя, вызначэнне асноўных этапаў развіцця нацюрморта, выяўленне вобразна-стылістычных асаблівасцяў яго развіцця. У сваёй дысертацыі аўтар дэталёва аналізуе спецыфіку адлюстравання мастакамі прадметнага свету, разглядае ўплыў на творы мастацтва асаблівасцяў гістарычнага перыяду, сацыяльнага і культурнага асяроддзя. Асаблівая ўвага надаецца выяўленню аўтарскіх жывапісных падыходаў да вырашэння тых, ці іншых тэм і матываў у нацюрморце. Саіскальнікам упершыню, ўводзіцца ў навуковы абарот даволі значны аб'ём матэрыялаў па творчасці беларускіх мастакоў, што працавалі ў галіне нацюрморта ў ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя.

У дысертацыі адлюстравана шырокая панарама эвалюцыі жанру нацюрморта, паслядоўна вырашаны заяўленыя ў рабоце задачы. На падставе прааналізаванага матэрыялу Я.У. Федарэц прадстаўляе пераканаўчыя, лагічна пабудаваныя вывады.

Аб актуальнасці і перспектыўнасці работы Я.У. Федарэц сведчыць і той факт, што вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні комплексных работ па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя, у навукова-даследчай і выставачнай рабоце галерэй і музеяў Рэспублікі Беларусь .

Аўтарэферат дысертацыі Я.У. Федарэц на тэму "Нацюрморт у беларускім жывапісе ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя" аформлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі, што прад'яўляюцца да падобнага рода навуковых прац, дакладна адлюстроўвае навуковую пазіцыю дысертанта, раскрывае актуальнасць, навіну, мэты і задачы даследавання. Навуковая абгрунтаванасць прадстаўленых у дысертацыі вывадаў не выклікае сумненняў і пацвярджаецца высокім узроўнем іх апрабацыі. Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання Я.У. Федарэц прайшлі апрабацыю на шэрагу канферэнцый, па тэме дысертацыі аўтарам апублікавана значная колькасць артыкулаў (33 публікацыі).

Усё вышэй адзначанае, дае падставы лічыць, што аўтарэферат у поўнай меры адлюстроўвае аб'ём праведзенай аўтарам работы, паццвярджае высокую прафесійную падрыхтоўку Я. У. Федарэц, падкрэслівае наватарскі характар яе спробаў комплекснага вывучэння праблемы і сведчыць аб тым, што дысертант заслугоўвае прысваення яму ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Даю згоду на размяшчэнне водгуку на афіцыйным сайце ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі".

Кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва
УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» М. Л. Цыбульскі

Подпись удостоверяю
Начальник отдела кадров
Е.П. Соловьёва